ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 23 (991) | АЎТОРАК, 28-га студзеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Шчырае прывітаньне ЦК ЛКСМБ і яго баявому органу газэце „Чырвоная Зьмена“

Конфэрэнцыя рабочай моладзі менскай швэйнай фабрыкі „Акцябр“ і саўгасна-колгасная, батрацка-бядняцкая і серадняцкая моладзь Глускага сельсавету, Пухавіцкага раёну, якая была склікана для заключэньня дагавору соц. спаборніцтва па суцэльнай колектывізацыі Глускага сельсавету—шле шчырае пролетарскае прывітаньне ЦК ЛКСМБ і яго баявому органу газэце „Чырвоная Зьмена“.

Конфэрэнцыя абгаварваючы шэраг актуальнейшых пытаньняў па ўдзелу рабочай моладзі фабрыкі „Акцябр“ у ажыцьцяўленьні пяцігодкі ў чатыры гады, а таксама працоўная моладзь з Глускага сельсавету па суцэльнай колектывізацыі сельсавету да вясеньняга севу 30 году, на аснове заключанага социялістычнага дагавору запэўняем вас, што ўсе намечаныя задачы пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, мы з гонарам выканаем.

Хай жыве ідэя Леніна—социялістычнае спаборніцтва, практычна пачатае па ініцыятыве ленінскага комсамолу.

ПРЭЗЫДЫУМ

Усе комсамольцы, маладыя рабочыя—у шэрагі ўдарнікаў!

„ЦК адабрае пастанову ЎсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ аб Ленінскім наборы новых ударных брыгад і падкрэсьлівае, што прафсаюзы павінны забясьпечыць на справе правядзеньне гэтай пастановы ў жыцьцё, шляхам узмацненьня сваіх кадраў і правядзеньня чысткі профапарату ад косных і бюракратычных элемэнтаў“

(З адозвы ЦК УсеКП(б).

„ЦК лічыць, далей зусім недапушчальным той факт, што ва ўдарных брыгадах удзельнічае толькі невялікая частка комуністых і комсамольцаў. ЦК абавязвае ўсе партыйныя і комсамольскія організацыі накіраваць усе сілы на тое, каб забясьпечыць пагалоўны ўдзел усіх комуністых і комсамольцаў ва ўдарных брыгадах

(З адозвы ЦК УсеКП(б)

На заклік партыі Леніна адкажам: масавым уступленьнем ва ўдарныя брыгады, ператварэньнем ва ўдарныя цэлых цэхаў, фабрык і заводаў; 100 процантным выкананьнем промфінпляна.

ПРОЛЕТАРЫ МЕНСКУ ПАПАЎНЯЮЦЬ ШЭРАГІ ПАРТЫІ І ЎДАРНІКАЎ

Ленінскі прызыў ударнікаў

На шкляной гуце „Пролетары“ учора днём адбыўся сход рабочых 1-ай зьмены выдувальнага цэху. Цэх пастанавіў аб'явіць сябе ударным. Учора ноччу і сёньня адбудуцца сходы астатніх зьмен і цэхаў.

У сувязі з VI-ай гадавінай сьмерці Леніна і чысткай партыі ў ячэйку паступіла 19 заяў ад рабочых, якія прыняты ў шэрагі партыі. Шмат таварышоў, якія ўступілі ў партыю, маюць па 25, 18 і 15 год вытворчага стажу.

Учора днём на заводзе „Бальшавік“ адбыўся мітынг рабочых хромавага цэху. Цэх пастанавіў аднагалосна аб'явіць сябе ўдарным і выклікаў астатнія цэхі пасьледаваць яго прыкладу. Група рабочых хромавага цэху ў ліку 8 чалавек падалі заяву аб уступленьні ў шэрагі ленінскай партыі.

Завод „Энэргія“ абвясьціў сябе ўдарным

4 цэхі падалі колектыўныя заявы аб уступленьні ў партыю Леніна

Учора ўвечары пасьля працы адбыўся лятучы мітынг рабочых заводу „Энэргія“, на якім быў заслухан даклад намесьніка Наркампрацы СССР тав. Талстапятава аб ленінскім наборы ўдарнікаў.

Рабочыя аднагалосна пастанавілі абвясьціць свой чырвонаштандартны завод „Энэргія“ ударным.

Па прапанове беспартыйных рабочых 4 цэхі (ліцейны, сьлясарназборачны, мэханічны і вагавы) колектыўна падалі заявы аб уступленьне ў шэрагі комуністычнай партыі.

Завод „Энэргія“ выклікаў на пераклічку ўсе чырвонаштандартныя заводы і колгасы Беларусі.

Сход накіраваў прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ.

Тузаў.

19 новых брыгад—вянок на магілу Леніна

Адбыўся мітынг на фабрыцы „Адраджэньне“ прысьвечаны VI-й гадавіне сьмерці У. І. Леніна. Пасьля дакладу, рабочыя адзін за другім выступалі і аб'яўлялі сябе ўдарнікамі. У прынятай рэзалюцыі гаворыцца: „Социялістычнае спаборніцтва зьяўляецца адным з найлепшых шляхоў для выкананьня і перавыкананьня пяцігодкі ў чатыры гады“.

Організацыя 19 новых ударных брыгад у чатырох цэхах з колькасьцю 300 рабочых—наш вянок на магілу т. Леніна.

Піла.

Перайсьці да ўдарнай друкарні

27-га студзеня адбыўся мітынг рабочых друкарні БДВ, прысьвечаны ленінскім дням і ленінскаму прызыву ва ўдарныя брыгады.

Тут-жа на сходзе **два цэхі—пераплётны і канвэртны абвясьцілі сябе ўдарнымі.** Акрамя таго, група чорнарабочых абвясьціла сябе ўдарнай групай. Такім чынам мы маем у друкарні БДВ 275 чалавек, ахопленых ударнымі брыгадамі і цэхамі і 80 чалавек ахопленых індывідуальнымі дагаворамі па соцспаборніцтву. Сход пастанавіў лічыць неабходным абвясьціць жорсткую барацьбу прагулам і ў бліжэйшы час **перайсьці да ўдарнай друкарні.**

Бройдо.

БРЫГАДА-КАМУНА

У вагонным цэху Гомельскага паравоза-вагонна-рамонтнага заводу імя Ланцуцкага, ударная маладзежная брыгада зьнізіла сабекошт продукцыі на 10 проц., значна палепшыла якасьць продукцыі, зьнішчыўшы зусім прагулы і спазьненьні.

У пачатку 30 году брыгада **абвясьціла сябе брыгадай-камунай.** Увесь заработак брыгады падзяляецца пароўну паміж яе членамі, у залежнасьці ад разрадаў. Інструманты кожнага сябра брыгады пераходзяць у агульнае карыстаньне. Уся брыгада і кожны ўдарнік паасобку адказвае за інструманты і якасьць работы.

Цуфэяў.

УДАРНАЯ „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“

Завод „Чырвоная Зорка“ (Менск) на заводзкой конфэрэнцыі ўдарных брыгад абвешчаны ўдарным. Ужо маюцца некаторыя дасягненьні.

Квасільнае аддзяленьне, якое цалкам складаецца з ударных брыгад, зэкономіла 88 рублёў. Упакоўка і выпаска дражджэй далі эканоміі 116 рублёў 26 кап. Колектыў зьбіўшчыкаў (3 чалавека) за два месяцы з'эканоміў 18 рублёў 15 кап.

Рабочыя далі сваё абяцаньне партыі і савецкай уладзе, што пяцігадовы плян выканаюць на працягу 4-х год. Трэба спадзявацца, што словы рабочых не застануцца на паперы.

Рабочы.

Увесь фабзавуч ударны

Нядаўна агульны сход школы ФЗВ дрэваапрацовачнікаў у Бабруйску, заслухаўшы даклад аб выніках апошняга плenуму ЦК УсеЛКСМ, пастанавіў **абвясьціць увесь фабзавуч ударным.**

Агульны сход вучняў школы цалкам далучыўся да пастановы комсамольскай ячэйкі. Пастаноўлена разьбіць усіх вучняў на дзьве групы па агульным разьвіцьці і пасьпяховасьці з такім разьлікам, каб вучняў з большым разьвіцьцём падрыхтаваць майстрамі вышэйшай кваліфікацыі.

Мы прыложым усе сілы, каб узятую на сябе назву ўдарнікаў выканаць.

С. Рудніцкі.

Па тэлефону 12—19

— 26 студзеня ўвечары адбыўся сход рабочых заводу „Комунар“, на якім з дакладам выступіў адказны сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Гей.

Пасьля дакладу ўсе рабочыя кузьнечнага і сьлясарнага цэху падалі заявы аб уступленьні ў шэрагі компартыі.

— Учора ў часе абедзеннага перапынку адбыўся лятучы мітынг рабочых цэнтральнай базы Гандальбуду на якім быў заслухан даклад аб ленінскім закліку ва ўдарныя брыгады.

Рабочыя ў ліку 80 чалавек (за выключэньнем чорнарабочых) абвясьцілі сябе ўдарнымі.

— У сувязі з ленінскімі днямі і ленінскім заклікам ва ўдарныя брыгады 26 і 27 студзеня на абутковай фабрыцы адбываліся сходы рабочых.

У выніку гэтых сходаў рабочыя загатовачнага цэху, якія не састаялі ва ўдарных брыгадах усе як адзін уступілі ў іх. Таксама абвясьціў сябе ўдарны сьлясарны цэх.

85 чалавек машыннага цэху падалі заявы аб уступленьні ва ўдарныя брыгады. Больш 50 рабочых з вытворчым стажам ад 25 да 5 год падалі заявы аб уступленьні ў шэрагі ленінскай партыі.

Крызіс фашысцкай дыктатуры ў Гішпаніі

Расьце паўстанцкі рух ва ўсёй гішпанскай арміі

БЭРЛІН, 27. „Ротэ-Фанэ“ паведамляе, што фашысцкая дыктатура Гішпаніі перажывае цяжкі крызіс. У Гішпаніі расьце паўстанцкі рух ва ўсёй арміі супроць дыктатуры Прымо-дэ-Рыверы, барацьба супроць якога становіцца масавым народным рухам. Сяляне па ўсёй Гішпаніі аказваюць моцнае супраціўленьне падатковаму рэжыму. У некаторых акругах адбыліся крывавыя сутычкі паміж поліцыяй і сялянамі, якія адмаўляліся плаціць падаткі. У Гішпаніі расьце забастовачны рух рабочых, якія прастэстуюць супроць зьніжэньня зарплаты і прадаўжэньня працоўнага дню.

Мэксіканскі ўрад адклікаў сваю місію з Масквы

„Амэрыка прыняла на сябе кіраўніцтва рухам за адзіны фронт імпэрыялістычных дзяржаў супроць СССР“

НЬЮ-ЁРК, 27. Па паведамленьнях з Мэксыкі, мэксыканскі ўрад адклікае свайго паверанага ў справах з Масквы. Таварыш міністра замежных спраў Мэксыкі заявіў прадстаўнікам друку, што нядаўнія анты-мэксыканскія дэмонстрацыі, якія адбыліся ў розных гарадох Амэрыкі, „кіраваліся з СССР“, пагэтаму мэксыканскі ўрад адклікае ўвесь пэрсонал мэксыканскай місіі.

Орган компартыі „Дэйлі Ўоркер“ піша: „Гэты разрыў падцьвярджае, што Амэрыка прыняла на сябе кіраўніцтва рухам за адзіны фронт імпэрыялістычных дзяржаў супроць СССР“. Газэта падкрэсьлівае, што дзеяньні мэксыканскага ўраду выцякаюць з экономічнага крызісу капіталістычнага сьвету, які паскарае выступленьне супроць СССР і зьяўляюцца вынікам тэй політыкі, адносна якой вялі перагаворы Макдональд і Гувэр. У мэксіканскіх політычных колах заяўляюць, што разрыў канчаткова падцьвярджае гегемонію Амэрыкі над замежнай політыкай Мэксыкі.

Сьлёзатачывыя бомбы супроць рабочых

ВАРШАВА, 25. У Граундэнцы і Торне ўжо некалькі дзён працягваюцца дэмонстрацыі беспрацоўных. Па вестках газэты „Экспрэс Поранны“ уладай распрацавана інструкцыя аб ужыцьці сьлёзатачывых бомбаў супроць дэмонстрантаў.

Проэкт новага календара

унесен на зацьвярджэньне СНК СССР

МАСКВА, 26. Урадавая камісія па беспэрапынцы прадставіла ў Савет Народных Камісараў на зацьвярджэньне проект новага календара. По новаму календару леталічэньне пачынаецца з 1917 г.—году пролетарскай рэволюцыі—7-га лістапада. Гаспадарчы год пачынаецца з 1-га студзеня. Год падзяляецца на 12 месяцаў, якія маюць па 6 пяцідзённых тыдняў. Пяць дзён рэволюцыйных сьвят уключаецца ў адпаведныя месяцы як дубліраваныя дні: 1-а мая і 1-б мая зьяўляюцца днямі інтэрнацыяналу, 7-а лістапада і 7-б лістапада—сьвята пролетарскай рэволюцыі. Назвы месяцаў і дзён застаюцца ранейшыя, акрамя суботы і нядзелі, якія адпадаюць.

Ударнікі павысілі вытворчасьць працы

Гомельская абутковая фабрыка пры наліччы 13 ударнікаў выпускала па **600** пар абутку ў дзень. Сярэдні заробак рабочага быў **65** рублёў. Зараз маецца 125 ударнікаў і выпускаецца па **800** пар абутку ў дзень. Заробная плата даходзіць да 90 рублёў у месяц. Вытворчасьць працы, згодна соцдагавору павінна была павысіцца на **23,5 проц.**, павысілася-ж толькі на **18,3 проц.**—недавыкананьне на **5,2 проц.**

Загатовачны цэх абвясьціў сябе ўдарным. Маюцца і недахопы. Былі выпадкі, калі рабочыя адмаўляліся ад удзелу ў соцспаборніцтве. Партыя і профэсыянальныя організацыі не зьвярталі на гэта ўвагі. Вучоту браку не вядзецца. Частыя прогулы, прастоі і перакідваньні з адное працы на другую перашкаджаюць павышэньню вытворчасьці. Сыравіна дастаўляецца з вялікім спазьненьнем і дрэннай якасьці. Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсонал да работы адносіцца вельмі дрэнна,—не дапамагае брыгадам у працы.

Сідарук.

Барысаўскі ўдарны

Барысаўскі гаркомбінат у ліку 400 рабочых абвясьціў сябе ўдарным. *Адразу зьменшыліся прагулы, сымуляцыі, п'янкі, спазьненьні і г. д. 70 рабочых ударнай брыгады вырашылі дабраахвотна выехаць у вёску.*

Захар Гурэвіч.

***

Загатовачны цэх менскай абутковай фабрыкі ў ліку 175 рабочых **абвясьціў сябе ўдарным.** *Апрацовачны цэх таксама ўступіў у брыгаду. Адстае машынны цэх. Там быў выпадак зьняцьця з працы комсамольца-брыгадзіра* Карпэля *за невыкананьне загаду майстра.*

„Л. К.“

Заданьне юнкору

Тэрмінова шлі матар'ялы, як у вас разгортваецца работа па ленінскаму набору ва ўдарныя брыгады.

Як кіруе гэтай работай партыйная, комсамольская і профэсыянальная організацыі?

— Хто ўступае ў брыгады, іх вытворчы стаж і кваліфікацыя? Не цягні ніводнага дня,—прысылай матар'ял тэрмінова.

Рэдакцыя „Ч. З.“.

АБГАВАРВАЕМ ЛІСТ КІЗЕЕВА

„У чым я вінаваты перад комсамолам“

Кізееў зьяўляецца падкулачнікам, які пралез у комсамол для таго, каб стварыць сабе кар'еру

КІЗЕЕЎ—КАР'ЕРЫСТЫ

Таму комсамольцу, які ўступае ў комсамол толькі для кар'еры, а не для работы, бязумоўна не павінна быць месца ні ў комсамоле, ні на курсах комсамольскага актыву.

У той час, калі ў нас ідзе барацьба на вёсцы з кулаччом, дзе комсамольцы павінны быць першымі ў правядзеньні генэральнай лініі партыі, Кізееў ня хоча весьці барацьбы, ён толькі стараецца паехаць вучыцца; маскуючыся тым, што ён бядняк—пападае на курсы комсамольскага актыву.

Я лічу, што ні ў якім разе правільна не зрабілі, паслаўшы яго на гэтыя курсы, бо кар'ерыстым ня месца на курсах. Імкненьнем стварыць кар'еру Кізееў ужо ясна паказвае, што ён ішоў у комсамол выключна для сваіхшкурніцкіх мэт.

Да паступленьня на курсы, жывучы з бацькам, нічога не зрабіў для таго, каб уцягнуць яго ў колгас.

Ячэйка п р а в і л ь н а зрабіла выключыўшы Кізеева з комсамолу і з комсамольскіх курсаў.

Трэба таксама ўдарыць яшчэ і па тых, хто падпісваў анкету,якую прадстаўляў Кізееў на курсы.

Протчанка З.

№-кі отралковы полк, Менск.

ТАКІМ НЯ МЕСЦА Ў КОМСАМОЛЕ

Прачытаўшы і абгаварыўшы ліст Кізеева ў рэдакцыю „У ЧЫМ Я ВІНАВАТ ПЕРАД КОМСАМОЛАМ“, падтрымліваем пастанову ячэйкі комсамольскіх курсаў актыву аб выключэньні Кізеева з КСМ і курсаў.

Лічым, што Кізееў зрабіў недапушчальны ўчынак, як комсамолец захаваўшы свае соцыяльнае становішча з мэтай стварыць сабе кар'еру.

Кізееў, будучы на сваёй гаспадарцы, ня толькі не стараўся з'агітаваць свайго бацьку ў колгас. але сам практычна ад гэтага ўхіляўся.

Выключэньне Кізеева з шэрагаў КСМ ячэйкаю зроблена правільна, бо такія „актывістыя“ на справе на практыцы ня могуць праводзіць лінію партыі і быць прыкладнымі комсамольцамі.

Фішалевіч і Краўцова.

Віцебск.

„АКТЫВІСТЫ“

Зусім зразумела для кожнага комсамольца і організацыі цалкам, што ўчынкі, накшталт такога, які зроблены комсамольцам „актывістым“ Кізеевым, мы павінны выпальваць, выключаючы з комсамолу тых, хто гэта робіць. А таксама змагацца і з тымі, хто часта пад выглядам бедняка і батрака пралазіць у шэрагі комсамолу і партыі.

Ці вінаваты Кізееў? Я адказваю, што так.

Разам з Кізеевым трэба таксама абвінавачваць і тую комсамольскую ячэйку, якая ведала аб ім і ведала аб тым, што ён падрабіў дакумэнты, а мер ня прымала.

Формальныя адносіны ячэйкі да пасылкі на курсы такіх „беднякоў“ — павінны быць асуджаны ўсёю організацыяй. Комсамольская ячэйка павінна была паставіць пытаньне перад Кізеевым па ўсіх галінах работы проста, так, як мы зараз ставім пытаньне перад кожным комсамольцам, што ня толькі трэба агітаваць за колгас, але патрэбна быць там самому.

У Кізеева гэтага ня было.

Ці карысны ён для комсамолу?

Комсамолец тады карысны, калі ён практычна змагаецца за правядзеньне лініі партыі аб колектывізацыі, а ня лічыцца актывістым толькі на словах.

Лічу, што яго з комсамолу выключылі правільна.

Міхайлоўскі.

Ворша, №-кі полк.

Кізееў—добры комсамолец

Паступіўшы ў комсамол, Кізееў вядзе адпаведную працу сярод моладзі па організацыі ячэек ТСАвіяхіму і МОПР'у ў сваёй вёсцы.

Вучачыся яшчэ ў сямігодцы ў м. Стрэшыне ён сярод вучняў організоўваў гурткі па чытцы газэт і, як старэйшы вучань, вёў растлумачальную працу сярод нас.

Учынак, які зараз лічыцца за Кізеевым, трэба сказаць. ня мае абгрунтаваньня. Калі па сутнасьці разглядзець гэту справу, то віна Кізеева заключаецца толькі ў ашуканстве ячэйкі курсаў. Разам з гэтым лічу, што Кізееву бязумоўна магчыма вучыцца ў школах.

Чахоўскі Алесь.

Лесазагатоўкі

Больш бальшавіцкай напорыстасьці

Зламаць рашучым нажымам галавацяпства і формалізм загатоўчых організацый

Соцспаборніцтвам і клясавай сьвядомасьцю дадзім адпор кулацкай хлусьні і дэзэртырству з лесазагатовак

Прарывы у лесазагатоўках

24-га студзеня ў Лесбеле адбылася нарада працаўнікоў Лесбелу сумесна з рабочай брыгадай заводу „Дрэваапрацовачнік“, якая езьдзіла па лесазагатоўчым вучасткам. На нарадзе заслухоўваліся інформацыі аб ходзе лесазагатовак. Брыгадзіры інформавалі аб цэлым шэрагу ненармальных зьявішч, якія назіраюцца ў Магілеўскай акрузе на лесазагатоўчых вучастках. На Беляніцкім вучастку рахункавод робіць няправільныя разрахункі з рабочымі, крэдытныя таварыствы, якія аплачваюць возчыкаў, робяць аплату неакуратна і сяляне прымушаны хадзіць за дзесяткі вёрст па некалькі раз за платай.

У шмат якіх мясцох Магілеўскай акругі наглядаецца валакіта з нарадамі па разьмеркаваньню продуктаў. Такія-ж выпадкі сустракаюцца і ў Чэрвеньскім і Вузьдзеньскім раёнах (Меншчына), дзе коопэрацыя таксама ня прыняла ніякіх мер да забясьпечаньня лесарубаў неабходнымі продуктамі.

„Разумны“ адказ

Соцспаборніцтва і ўдарныя брыгады, як лепшы мэтад комуністычнай працы на вытворчасьці, не знайшлі сабе месца на лесазагатоўчых вучастках. Уступаюць у соцспаборніцтва толькі служачыя кантор. Калі Вузьдзенскі лесараён выклікаў на соцспаборніцтва Мазырскі лесараён, дык апошні не згадзіўся ўступіць у соцспаборніцтва матывуючы тым, што „трактар ня можа прыняць выклік сахі“.

Такі „разумны“ адказ з боку Мазырскага лесараёну на выклік Вузьдзенскага лесараёну трэба кваліфікаваць як апашленьне і наплявацельскія адносіны да соцспаборніцтва.

Дэзэртыраў гаспадарчага фронту—вон з комсамолу

У свой час па лініі комсамолу БССР было мобілізавана больш 15.000 комсамольцаў на лесазагатоўкі. Побач з добрымі адносінамі комсамольцаў да працы на лесазагатоўках, наглядаюцца выпадкі, калі паасобныя комсамольцы ня выканалі свой абавязак перад дзяржавай на гаспадарчым фронце.

Па Магілеўскай акрузе, напрыклад было мобілізавана 2800 чалавек, а працуе ня больш як 20 проц. з ліку мобілізаваных. У В ы с а ч а н с к і м р а ё н е (Віцебшчына) з мобілізаваных 100 комсамольцаў—на працу выйшла 30 чалавек, двое з іх набраўшы продуктаў на 35 рублёў (а зарабілі яны на рабоце—10 рублёў)—уцяклі. Прычым, адзін комсамолец украў пілу, а калі яго злавілі і запыталі: „Ты комсамолец?“, дык ён адказаў: „Білет нічога не каштуе, а піла—15 рублёў“.

Трое комсамольцаў з гораду Віцебску, якія былі пасланы на лесазагатоўкі, напіліся і прыехалі ў вёску Бадзінавічы, дзе вакол іх сабраўся вялікі натоўп сялян.

У Сураскім раёне 32 комсамольцы, мобілізаваныя на лесазагатоўкі, пакідалі свае комсамольскія білеты, а тыя, што вышлі на работу фактычна псуюць лес: рэжуць пні на вышыні грудзей, выпрацоўваюць 0,3 проц. нормы, а патрабуюць поўнасьцю аплаты па існуючай норме.

У Сененскім раёне дэлегацыя комсамольскай брыгады патрабавала ад канторы Лесбелу аплаты камандыровачных. Калі запатрабавалі ад іх работы, яны адказалі: „Мы зробім. колькі зможам, а ваша справа нас забясьпечыць“.

Даць рашучы адпор кулацкай агітацыі

У шэрагу раёнаў наглядаюцца выпадкі кулацкай агітацыі супроць лесазагатовак і вывазкі лесу. Кулакі распаўсюджваюць розныя чуткі аб тым, што тыя сяляне, якія працуюць па вывазцы лесаматэр'ялаў, будуць абкладзены падаткам у разьмеры 60 проц. іх заработку, а зарабіўшы больш 500 рублёў будуць абкладзены падаткам у індывідуальным парадку. І дзякуючы гэтай кулацкай хлусьні паасобныя сяляне адмаўляюцца ехаць у лес.

Трэба адзначыць, што з боку саюза сельгаслесрабочых, камітэтаў сялянскай дапамогі, саўгасаў і калгасаў у многіх мясцох ня зьвернута ўвага, як да лесазагатовак,—таксама і да вывазкі лесу.

Такое становішча на лесазагатоўках прымушае біць трывогу аб тым, што плянавыя заданьні на многіх вучастках ня будуць выкананы. Комсамольскія комітэты павінны прыняць рашучыя захады да тых комсамольцаў, якія ўцякаюць з лесазагатоўчых вучасткаў і да тых, якія працуючы на месцы разлагаюць работу. Дэзэртыры працоўнага фронту павінны быць выкінуты з комсамольскіх шэрагаў.

Трэба павесьці растлумачальную работу сярод працоўнага сялянства аб непраўдзівасьці кулацкай хлусьні.

Організуем ударныя абозы з беднякоў і серадняков ва вывазцы лесу.

Неабходна зараз-жа разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва на лесазагатоўках і даць па руках тым, які апашляюць соцспаборніцтва.

Безадкладна забясьпечыць лесазагатоўчыя вучасткі неабходнымі продуктамі.

Х. Б.



Комсамольцы на лесазагатоўках. Пілуюць дрэва маторнай пілой. (Паўночная вопытная станцыя. Еліца).

Райкомаўскія абяцанкі прывялі да масавага дэзэртырства

Па Гомельскай акрузе на лесазагатоўчыя вучасткі ў свой час было мобілізавана 1180 комсамольцаў. Надзеяліся, што яны пакажуць прыклад ва ўсёй рабоце на лесазагатоўках. Але гэта толькі была надзея.

З лесазагатоўчых вучасткаў пачалося масавае дэзэртырства комсамольцаў, і на сёньняшні дзень з 1180 чалавек засталося ў лесе ня больш, чым 150 чалавек.

Такое становішча на лесазагатоўках тлумачыцца тым, што райкомы ЛКСМБ у часе мобілізацыі комсамольцаў абяцалі ім што будзе вялікая аплата, што праца вельмі лёгкая і г. д. І вось, на райкомаўскія абяцанкі пашлі нявытрыманыя комсамольцы, якія адразу расчараваліся „у залатых горах“, што ім абяцалі.

Цяпер АК ЛКСМБ прыняты рашучыя захады проці дэзэртыраў усьцяж аж да выключэньня.

На раёны кінуты ўдарныя брыгады для ажыўленьня работы на лесарасрацоўках.

Ж.

Юныя ленінцы Беларусі!

Наркамзем БССР ускладае на вас дзяржаўнае заданьне па ўдзелу ў вясновай кампаніі 1930 году

Усю сваю напорыстасьць і ініцыятыву накіруйце на выкананьне гэтай важнейшай політычнай задачы

Улічваючы агульныя задачы партыі і Савецкай улады ў справе правядзеньня вясновай пасеўнай кампаніі, якая мае вялікае політычна-эканамічнае значэньне для вырашэньня задач соцыялістычнай перабудовы ўсёй народнай гаспадаркі, улічваючы тое, што піянэр-організацыя ў вясновай пасеўнай кампаніі мінулага году правяла вялікую практычную працу, чым на справе паказала сябе актыўным памочнікам партыі, — Наркамзем БССР зьвяртаецца да піянэр організацыі Беларусі з прапановай: прыняць актыўны ўдзел у вясновай пасеўнай кампаніі 1930 г. і выканаць наступнае:

Правесьці шырокую растлумачальную працу па ўцягненьні сваіх бацькоў (сялян беднякоў і серадняков) у колгасы і розныя віды сельска-гаспадарчых коопэрацый. Організаваць работу па культурнаму абслугоўваньню дзяцей у 500 колгасах. Завербаваць 8 000 падпісчыкаў на часопіс „Шляхі колектывізацыі“ і распаўсюдзіць сярод колгасаў, саўгасаў і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак 10.000 экз. агранамічнай літаратуры—брашур-лістовак, выдаваемых НКЗ да вясновай сельска-гаспадарчай кампаніі.

Сіламі піянэраў і вучняў адсартаваць 50.000 пуд. насеньня для колгасаў і бядняцкіх гаспадарак, існуючымі зерна-ачышчальнымі абозамі і абслужыць 101 зерна-ачышчальны абоз.

Організаваць 100 дзіцячых сельска-гаспадарчых арцеляй па розных відах сельска-гасп. працы (гародніцтва, птушніцтва, садоўніцтва і г. д.)

Організаваць 300 паказальных піянэрска-школьных агародаў пры школах, колгасах, засеяўшы іх карнеплодамі, канюшынай і гароднымі культурамі.

Сабраць сіламі піянэраў і вучняў 50.000 пуд. попелу. Правесьці работу па выяўленьню месц, дзе знаходзіцца торф, вапна для ўгнаеньня глебы.

У школах і атрадах пачаць вывучэньне агра-мінімуму. Організаваць з старэйшых піянэраў і вучняў 50 гурткоў для падрыхтоўкі масларобаў і сыравараў.

Пабудаваць 10.000 шпакоўніц.

НАРКАМЗЕМ СПАДЗЯЕЦЦА, ШТО Ў ПРАЦЯГУ БЛІЖЭЙШЫХ 2-Х МЕСЯЦАЎ ПІОНЭР-ОРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСІ, ПРЫ ЎМОВАХ РАЗГОРТВАНЬНЯ НАЙШЫРЭЙШАЙ САМАДЗЕЙНАСЬЦІ, НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАЕ ГЭТАЕ ЗАДАНЬНЕ, АЛЕ І ЗНАЧНА ПЕРАВЫСІЦЬ ЯГО. НКЗ ПРАПАНУЕ ЎСІМ МЯСЦОВЫМ ЗЯМЕЛЬНЫМ ОРГАНАМ АКАЗВАЦЬ УСЯМЕРНАЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ І ДАПАМОГУ ПІЯНЭР-ОРГАНІЗАЦЫІ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЗАДАНЬНЯ.

Народны Камісар Зямляробства БССР
РАЧЫЦКІ.

Ад імя піонэрскай організацыі БССР дзяржаўнае заданьне прынята Цэнтральным Бюро Дзіцячых Комуністычных Організацый

Нам. Старшыні ЦБ ДКО пры ЦК ЛКСМБ
РЫВІН.

Трэба выправіць памылку

Сакратар саюзнай ячэйкі ЛКСМБ саюзу мэталістых (Менск) т. **Табачнік** зажымае самакрытыку, адзёргвае выступаючых комсамольцаў на сходах выкрыкамі: **„Я політычна пісьменны і разумею больш за цябе“** і г. д.

Табачнік самастойна бяз ведама бюро дагаварваецца з завкомам аб прадстаўленьні яму 4 дзён у тыдзень спэцыяльна для работы ў комсамольскай ячэйцы. Аб тым, як скарыстоўвае гэтыя дні, ён нікому не гаворыць нават з членаў бюро ячэйкі. Тэзісы свайго дакладу аб працы ячэйкі ён напісаў самастойна без узгадненьня з бюро.

Як комсамолец і сакратар ячэйкі Табачнік не карыстаецца аўтарытэтам сярод рабочых, часта кідае працу і ўходзіць выконваць комсамольскія нагрузкі. Ня любіць Табачнік і самакрытыкі.

Цяпер Табачніка вылучылі для паездкі на работу ў калгас. Цікава, што большасьць комсамольцаў галасавала за яго пасылку **выключна з мэтаю ад яго пазбавіцца.** Пакуль ня позна трэба адмяніць пастанову сходу аб пасылцы яго ў колгас і зьняць з кіруючай працы ў ячэйцы.

8 подпісаў членаў ячэйкі.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы лічым, што ячэйка няправільна паступіла, калі галасавала за пасылку комсамольца, які не карыстаецца аўтарытэтам, на работу ў колгас выключна з тэй мэтай, каб пазбавіцца ад яго. Такая пастаноўка пытаньня не комсамольская, не бальшавіцкая.

СКЛАСЬЦІ ПЯЦІГОДКУ КАДРАЎ

„Проблема кадраў зьяўляецца зараз, у абставінах тэхнічнай рэконструкцыі прамысловасьці, рашучай проблемай социялістычнага будаўніцтва“.. *І. Сталін*

Аб удзеле комсамолу ў плянаваньні падрыхтоўкі кадраў

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК УсеЛКСМ

адача падрыхтоўкі кадраў спэлістых—важнейшая задача усёй тыі—патрабуе уважліва распранага пляну патрэбнасьці ў спэлістых і іх падрыхтоўцы. Лідаўскі пленум ЦК УсеКП(б) і СССР даручылі Дзяржпляну працаваць такі плян к першаму віка. Гэта заданьне вялізарнай насьці і адказнасьці патрабуе Дзяржпляну асаблівага напруньня і баявога тэмпу работы ў вычайна складанай і нявыпраанай галіне плянаваньня кадраў. ьпех выкананьня гэтага заданьмагчымы пры актыўнай дапамоі ініцыятыўным садзейнічаньні е савецкае грамадзкасьці і, у шую чаргу, з боку комсамолу і фсаюзаў.

Надаючы першаступеннае знаньне рабоце Дзяржпляну па складаньню пяцігодкі кадраў, якая зьяўцца ў сучасных умовах ударнай, УсеЛКСМ прапануе ўсім комсамольскім організацыям забясьпецьь актыўную дапамогу Дзяржпляну і ўсім плянуючым органам, анізуючы грамадзкі кантроль над працоўкай пляну, дапамагаючы білізацыі гаспадарчых органаў і бліва профсаюзаў і мас моладзі справу распрацоўкі пляну.

Бюро ЦК даручае аддзелу працы адукацыі прыняць непасрэдны ел у рабоце Дзяржпляну, яго сэкі камісіі па складаньню пяцікі падрыхтоўкі кадраў праз організацыю спэцыяльных ударных игад з комсамольцаў прадпрыемаў і вышэйшых тэхнічных навуьных установаў, для чаго прапаваць МК УсеЛКСМ мобілізаваць комсамольцаў у распараджэньаддзелу працы і адукацыі і ржпляну.

Для абагуленьня вопыту перабуы вышэйшых тэхнічных навуьных установаў і распрацоўкі прапоў комсамолу для пяцігадовага ну кадраў стварыць пры ЦК камісію ў складзе т. т.: **Казлова** (ЦК), **Зайцава** (Дзяржплян), **Левіна** (МВТУ) з прыцягненьнем да працы камісіі вызначаных груп, ударных груп Варнітсо і буйнейшых вузаўскіх ячэек.

Прапанаваць камісіі ў двухтыднёвы тэрмін распрацаваць прапановы комсамолу па кадрах і прадставіць іх у бюро ЦК.

На 15 лютага склікаць усесаюзную комсамольскую нараду па пытаньню падрыхтоўкі кадраў, даручыўшы аддзелу Працы і Адукацыі правесьці падрыхтоўчую работу па скліканьню нарады.

Усім мясцовым організацыям ва ўдарным парадку організаваць распрацоўку сваіх прапаноў у адносінах пляну будаўніцтва ВНТУ і вузаў свайго раёну. Правесьці шырокае абгаварэньне аб тыпе спэцыялістых. Прыцягнуць да гэтага пытаньня шырокія масы моладзі, проф саюзы, інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі і гаспадарчыя органы. Безадкладна ўвесь сабраны і прапрацаваны матар'ял перадаць у аддзел Працы і Адукацыі ЦК для скарыстаньня ў камісіях Дзяржпляну.

Даручыць „Комсомольской Правде“ організаваць шырокае абгаварэньне аб тыпе спэцыялістых з прыцягненьнем да абгаварэньня навуковай ударнай брыгады Варнітсо і ВІТС пры УсеЦСПС.

Прапанаваць „Комсомольской Правде“ і мясцоваму комсамольскаму друку штодзённа асьвятляць усе пытаньні, зьвязаныя з падрыхтоўкай кадраў і іх плянаваньнем.

Даручыць аддзелу Працы і Адукацыі ЦК распрацаваць дырэктыву аб удзеле мясцовых організацый у плянаваньні кадраў.

ВОДГУКІ НА ЛІСТ ХАРКОВА. „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“ № 293

Менскі Політэхнікум павінен быць рэорганізаваны

Чакаем думак ад настаўніцкага складу Політэхнікуму, працаўнікоў ВСНГБ і Наркомасьветы

Ажыцьцяўляем пастановы лістападаўскага пленуму

(Ліст з Гомелю)

Прачытаўшы ў „Чырвонай Зьмене“ № 293 артыкул тав. Харкова аб падрыхтоўцы кадраў, я цалкам згодзен з яго прапановамі.

Гомельскі чыгуначны тэхнікум, адразу пасьля пастановы пленуму, узяўся за рэорганізацыю тэхнікуму. Мы скарацілі тэрмін навучаньня з 4 да 3 год, перагледзелі програмы, у якія нават быў уведзен такі прадмет, **як вывучэньне уласьцівасьцяй жаночага і казьлінага малака**—і гэта для тэхнікаў-мэханікаў! Практыка праводзілася толькі летам і зводзілася да таго, што студэнт назіраў за работай, а сам у ёй ня ўдзельнічаў, адсюль вывад, што апошняя (практыка) нічога не давала.

Зараз мы перашлі на бесьперапынную практыку. Апрача гэтага, мы парашылі праводзіць набор два разы ў год. Першы набор будзе праведзен 1-га лютага. Пры затрачваньні ў паўтары разы больш сродкаў, чым зараз, **мы зможам павялічыць выпуск спэцыялістых у два разы**. У той час, калі адна частка знаходзіцца на тэорытычных занятках, другая будзе на практыцы, такім чынам будзе поўнасьцю выкарыстоўвацца, як памяшканьні гэтак і настаўніцкі пэрсонал.

Вопыт у нас невялікі, але і ён ужо цалкам сябе апраўдаў. Дзеля гэтага лічу, што і рэшце індустрыяльных тэхнікумаў трэба безадкладна прыступіць да карэннай ломкі старых форм і мэтадаў навучаньня ў тэхнікумах.

Н. КРАСКОЎСКІ.

Трэба рэорганізаваць

Менскі Дзяржаўны Політэхнікум, —крыніца папаўненьня беларускай прамысловасьці тэхнічнымі кадрамі. Згодна з гэтым, навучаньне і падрыхтоўка ў данай навучальнай установе павінна цікавіць усю пролетарскую грамадзкасьць і ў першую чаргу Наркамасьветы, ВСНГБ і ЦСПСБ.

Аднак, да гэтага часу памянёныя організацыі не паклапаціліся ўстанавіць патрэбнай колькасьці спэцыялістых, ня выяўлен тып тэхніка. не забясьпечаны студэнты, не ахоплены вытворчай практыкай, адсутнічае контрактацыя і г. д. Таксама адсутнічае кіраўніцтва з боку профсаюзаў і інжынэрна-тэхнічнай сэкцыі. Прадстаўнікі, вылучаныя ад профсаюзаў, толькі наведваюць паседжаньні, але ня цікавяцца жыцьцём політэхнікуму.

Сувязь з вытворчымі рабочымі політэхнікуму недастатковая. Не зацікаўлены яго работай і партыйны і комсамольскі колектывы політэхнікуму. Востра паўстала неабходнасьць рэорганізаваць гідра-тэхнічнае і тарфянае аддзяленьні ў самастойныя тэхнікумы, з тэрмінам навучаньня 3 гады. Месцам для гэтых тэхнікумаў трэба вызначыць Горкі (Аршанскай акругі), як месца, у якім маюцца найлепшыя магчымасьці (кадры выкладчыкаў, спэцыялістыя, лябараторыі і інш.) для падрыхтоўкі спэцыялістых для сельскай гаспадаркі. Гэтыя тэхнікумы павінны быць падлеглымі Наркамзему.

У індустрыяльным політэхнікуме патрэбна пакінуць **будаўнічае аддзяленьне, шляха-будаўнічае горнае і хэмічнае**, якое таксама з цягам часу неабходна рэарганізаваць у самастойны хэмічны тэхнікум. З увядзеньнем бесьперапыннага тыдню, патрэбна перавесьці ўсю працу на бесьперапынны навучальны год; гэта павялічыць прапускную здольнасьць політэхнікуму і дасьць магчымасьць рабіць прыёмы два разы ў год.

Навучальныя пляны і програмы патрабуюць каранной перабудовы ў бок скарачэньня непатрэбных дысцыплін. Практычныя програмы (вытворчая практыка) таксама не адпавядаюць рэчаіснасьці, іх таксама трэба перагледзець з такім разьлікам, каб у хуткім часе навучаньне перавесьці на бесьперапынную вытворчую практыку. Словам, трэба навучальныя програмы і практыку перагледзець з тым, каб скараціць тэрмін навучаньня з 4 да 3 год.

Індустрыяльна-тэхнічнай асьветай павінен кіраваць спэцыяльны орган пры ВСНГ, гэтым не зьмяншаецца роля Наркомасьветы. Мэтазгодна і патрэбна падпарадкаваць політэхнікум ВСНГБ. Апошні павінен зараз-жа ўстанавіць колькасьць патрэбных яму спэцыялістых і тып патрэбных яму тэхнікумаў. ВСНГ таксама павінен адказваць за разьмяшчэньне студэнтаў па прадпрыемствах для праходжаньня бесьперапыннай вытворчай практыкі.

Н Герасімовіч.

Да перавыбараў т-ва „Чырвонага крыжу“

Падначаліць работу задачам соцбудаўніцтва

З 15-га сьнежня па 15-ае лютага 30 году Менскім камітэтам Чырвонага Крыжу праводзіцца справаздачная перавыбарчая кампанія усіх нізавых органаў ячэяк і райкомаў Чырвонага Крыжу. Прайшло больш двух тыдняў, а таго, што праца разгортваецца, яшчэ не адчуваецца. У гэтую перавыбарчую кампанію павінна быць завострана ўвага на пытаньне далейшага падвышэньня якасьці організацыі Чырвонага Крыжу і большае ўнядрэньне ў масы вайскова-санітарных ведаў, ахопу санітарнай падрыхтоўкай рабочых і сялян.

Перавыбарчыя кампанія павінна ўскалыхнуць усю грамадзкасьць і дабіцца каб кожная ячэйка і райкомы сапраўды прымалі ўдзел у социялістычнай перабудове ўсёй народнай гаспадаркі праводзячы ідэі культурнай рэволюцыі, аздараўленьне працы і быту на фабрыках, заводах, савгасах, колгасах, жактах, школах і інш.

Большасьць раённых камітэтаў і ячэяк неабходнага размаху ў разгортваньні соцспаборніцтва ўсё яшчэ ня маюць і гэта пытаньне ў час правядзеньня кампаніі павінна заняць належнае месца. Перавыбарчая кампанія павінна праводзіцца ва ўмовах шырока разгорнутай самакрытыкі

Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы задача паляпшэньня социяльнага складу таварыства Чырвонага Крыжу павінна стаць стрыжнем усёй працы. Па-гэтаму павінен быць зроблен рашучы пералом у напрамку абхопу таварыствам рабочых гораду, і батрацка-серадняцкай, калгаснай часткі насельніцтва вёскі. Разам з паляпшэньнем якаснага складу трэба пашырыць шэрагі таварыства Чырвонага Крыжу.

Ціхантоўскі.

Беларускі нацфашызм—агэнт польскага імпэрыялізму

(Працяг. Пачатак гл. у №№ 20 і 21)

Так званая соймавая „опозыя“ зьяўляецца спробай асьвяць дэмакратычны фасад фашысцкай дыктатуры і пашырэньня базы, якая ўсё звужаецца.

Цалкам і поўнасьцю правільным застаецца тэзіс VI пленуму аб тым, што ярці (паміж фашызмам і соцыял-фашызмам) не парушаюць адзінага фронту буржуазіі вакол фашысцкага ураду ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам і падрыхтоўкай вайны супроць СССР.

(Рэз. ЦК КПП).

Соцыял і нацыянал - фашызм на наперадзе контр-рэвалюцыйнага фронту захопніцкіх плянаў пілсудзкага і яны ўсё больш зрастаюцца з фашысцкім дзяржаўным апаратам.

Адзіны контр-рэвалюцыйны нацыянал-фашысцкі фронт

Усё-роўна, як па загаду пад штурмуючым напорам рэвалюцыйнага руху на фашысцкую дыктатуру, нацыянал-фашыстыя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны сталі організоўваць і каардынаваць сваю „работу“ для нападу на БССР і УССР; стала шырэй разгортвацца іх контр-рэвалюцыйная работа на ЗБ і ЗУ, якія зьяўляюцца плацдармам для фашызму. Напад украінскіх фашыстых на савецкае консульства ў Львове, організацыйная конфэрэнцыя украінскіх, беларускіх і літоўскіх фашыстых у Варшаве з мэтай барацьбы з нацыянальна-вызваленчым рухам, компартыяй і непасрэднай падрыхтоўкі вайны—усё гэта паказвае аб стварэньні адзінага фронту нацыянал-фашызму. Час не чакае; зараз-жа па гэтым агідным хаўрусе на Зах. Беларусі пачаліся новыя атакі фашызму праз беларускіх нацыянал-фашыстых на чале з ідэалёгам Луцкевічам.

На Зах. Беларусі Луцкевіч наперадзе контр-рэвалюцыйнага фронту

Нацыянал - фашысты Луцкевіч ужо добра ўсім вядомы, як папіхач, хвалебнік і праваднік політыкі шматлікіх окупацый на Зах. Беларусі, заядлы прадстаўнік і абаронца інтарэсаў беларускай буржуазіі і кулацтва, а таксама верны стаўленік польскага імпэрыялізму, ужо аднавіў і аформіў сваю політычную фашысцкую плятформу і ўжо пачаў выдаваць на фашысцкія грошы газэту „Наперад“.

Беларускі нацфашызм зрастаецца з фашысцкай дыктатурай

Калі раней беларускія „нашаніўцы“ (1906—18 гадоў) у якіх Луцкевіч быў адным з натхніцеляў, ідэолёгічна выяўлялі інтарэсы беларускай буржуазеі, актыўна змагаліся супроць Кастрычнікавай рэволюцыі на Беларусі і ішлі поплеч з ППС, дык у сучасны пэрыод, калі ППС і Бунд усё больш зрастаюцца з фашысцкім апаратам, а беларуская буржуазея і кулацтва гледзячы на ліквідацыю іх клясы ў БССР, шчыльней сплятаюцца з польскай буржуазіяй пры яе компромісах і з клясавай ашалеласьцю разам пачалі тачыць свае імпэрыялістычныя кłыкі. З другога боку рэволюцыйны рух у Польшчы і Заходняй Беларусі, які ўвесь час узмацняецца —гэты пэрыод з усёй няўхільнасьцю прыводзіць ідэолёга Луцкевіча і К-о непасрэдна зрастацца з фашысцкім дзяржаўным апаратам праз дэфэнзыву і іншыя ўрадавыя ўстановы. Беларускі нацыянал-фашысты Луцкевіч ужо моцна і неадарвана зросься з фашысцкай дыктатурай.

Як і ППС, зрастаючыся з дзяржаўным апаратам, каб прыкрыць гэта перад масамі, з шумам і „гвалтам“ узьняла „левую“ фразэолёгію ў абарону дэмократыі, махаючы каштоўнымі мячамі на фашысцкую дыктатуру. Усё гэта для ачмурваньня мас і адцягненьня іх ад непасрэднай барацьбы за зрынуцьце фашысцкай дыктатуры. Таксама і нацыянал-фашыстыя на вельмі адказным для фашызму нацыянальным фронце падняліся пад прыкрыцьцем „левых фраз“ і сеяньнем ашуканчых ілюзій.

Яры клясавы вораг нацыянал-фашызм у сваёй провакатарскай газэтцы „Наперад“ стараецца маскавацца тым, што нібы то ён зьяўляецца сапраўдным пераемнікам популярнай у масах Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады і „сапраўдным праваднікам“ нацыяльна-вызваленчага руху.

Ня сьцерці крывавых сьлядоў правакатараў хаўрусу Луцкевічаў-Гурына

Але працоўныя Заходняй Беларусі ўжо ад гэтых прайдох шмат чаго мелі. Яны ведаюць, як гэтыя заядлыя ворагі працоўных ня толькі Заходняй Беларусі, але і Савецкай Беларусі, у свой час, каб не застацца за бартом ад мас уцёрліся ў шэрагі нацыянальна-вызваленчага руху, каб яго справакаваць і зьнішчыць. Польская буржуазея і абшарнікі не хацелі тады дзяліцца эксплёатацыяй рабоча - сялянскіх мас Заходняй Беларусі, так як-бы гэта хацелася беларускай буржуазіі. Беларуская буржуазія і кулацтва не дапускалася да самаўрадовага карыта, не дазвалялася ім ва ўстановах гаварыць па-беларуску. Для гэтага ідэолёгі іх Луцкевічы і былі прымушаны рабіць тады опозіцыйныя манэўры да польскага ўраду.

Апрача таго, трэба адзначыць, што пераход да нэп'у ў СССР Луцкевічы спадзяваліся, што Савецкая Беларусь перародзіцца ў капіталістычную, буржуазную „незалежную Беларусь“ Луцкевічаў.

З вялікай прагавітасьцю Луцкевічы сачылі за зьдзейсьненьнем свах контр-рэволюцыйных мараў. І ім здавалася, што яны падцьвярджаюцца тым, што ў Савецкай Беларусі на асобных вучастках соцыялістычнага фронту правымі опортуністамі і нацыянал-дэмократамі скрыўлялася генэральная партыйная лінія (прышчэпаўская хутарызацыя, скажалася партыйная лінія і ў кооперацыі і на культурным фронце, дзе неўгамонна калупаліся таксама старыя прайдохі нацыянал-дэмократаў, верныя пабратымцы Луцкевіча).

П. С—к.

„Чырвоную Зьмену“ у масы!

Праверым выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў

ДАВЯДЗЕМ ТЫРАЖ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“ ДА 2С ТЫСЯЧ!

Праверыць умовы

Шэраг гарадзкіх і вясковых організацый комсамолу, улічваючы важнасьць прасоўваньня цэнтральнага органу комсамолу Беларусі—„Чырвонай Зьмены“ у масы комсамольскай працоўнай моладзі, уступілі ў соцыялістычнае спаборніцтва. Масавая работа вакол газэты, работа з юнкорамі кіраўніцтва насьценгазэтамі, тыражны рост „Ч. З.“—вось мэта спаборніцтва паміж організацыямі.

Трэба ўжо зараз у пэўнай ступені падвесьці некаторыя вынікі спаборніцтва.

З кастрычніка 1929 году рост тыражу „Чырвонай Зьмены“ ідзе шпаркім крокам. 19 тысяч падпісчыкаў на студзень супроць 8 тысяч у верасьні—досыць яскрава сьведчаць, што ў гэтай галіне агульнае выкананьне абавязкаў, узятых організацыямі, праходзіць больш-менш задавальняюча, але гэта толькі агульна.

Па асобных організацыях рост тыражу газэты ідзе надзвычайна слабым тэмпам, прыкладна: у Гомелі на некалькі тысяч комсамольцаў выпісваецца „Чырвонай Зьмены“ 949 экзэмпляраў, у Віцебску—953 экз., Магілёве—471 экзэмпляр. Такі-ж малюнак і па некаторых раёнах—Бешанковічы, Высачаны (Віцебскай акругі) на некалькі сот комсамольцаў выпісваюць толькі 41 экзэмпляр. А Камарынская раённая організацыя ўмудрылася выпісаць толькі 13 экзэмпляраў. Лічбы патрабуюць пасіленьня тэмпу росту тыражу ў адсталых акругах і раёнах. Гэта мае цесную сувязь з выкананьнем прапаноў Першай Усебеларускай Конфэрэнцыі аб 25 тысячным тыражы „Чырвонай Зьмены“,—ахопам 30 проц. комсамольскай організацыі падпіскай на „Чырвоную Зьмену“.

Адным з сродкаў пасьпяховага ўкараненьня газэты ў сыстэму комсамольскай работы, выкарыстаньня матар'ялу газэты ў рабоце ячэйкі, популярызацыі замацаваньня тыражнага росту, ёсьць масавая работа вакол газэты, што прадугледжвае і умовы спаборніцтва. Але разгортваньне гэтай работы ў ячэйках праходзіць тугавата. Такі факт, як няведаньне на якой мове друкуецца „Чырвоная Зьмена“ (ячэйка „Утылізацыі“, Менск) гаворыць, што ў напрамку, азнаямленьня моладзі з зьместам газэты нічога ня робіцца. Пункты дагавароў, якія прадугледжваюць масавую работу вакол газэты, застаюцца толькі пунктамі на кавалку паперы. Між тым масавая праца з газэтай спрыяла-б больш пасьпяховаму выкананьню ўмоў спаборніцтва.

Ня лепш пастаўлена работа з юнкорамі і насьценгазэтамі. За выключэньнем часткова Гомелю, пункты ўмовы спаборніцтва па працы з юнкорамі зусім ня выконваюцца (Кастрычніцкаўскі раён, Менск).

Вось, увогуле, малюнак работы па спаборніцтву.

Трэба канстатаваць, што і з боку бюро ячэек дастатковай увагі гэтаму пытаньню не ўдзяляецца па шэрагу ячэек спаборніцтва не популярызавана. Ёсьць ячэйкі якія ня ведаюць пра абавязкі, узятыя організацыяй. Зусім не зварочваецца ўвагі на якасны падбор ячэйкавых упаўнаважаных, замест замацаваньня паказаўшага сябра на гэтай працы з добрага боку упаўнаважанага яго часта пераводзяць на іншую работу, напрыклад у Менску (Політэхнікум, „Эльвод“). Неабходна кожнай ячэйцы і комбінату праверыць дасканала выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў.

Зараз, у зьвязку з трохмесячнікам беларускай пролетарскай культуры і культуры нац. меншасьцяў, прасоўваньне „Чырвонай Зьмены“ набывае асаблівае значэньне.

Выкананьне ўмоў спаборніцтва трэба ўвязаць з ажыцьцяўленьнем прапаноў першай усебеларускай конфэрэнцыі комсамолу.

ДЗЯНІСАЎ.

ДВА І ТРЫЦЦАЦЬ ТРЫ

У комсамольскай ячэйцы пры **Парыцкай ШСМ** (Бабруйшчына) „Чырвоную Зьмену“ выпісвае толькі адзін комсамолец.

У школе маецца **каля 100** вучняў з якіх **20 комсамольцаў**, а ўсяго яны выпісваюць... **2** экзэмпляры „Чырвонай Зьмены“.

Калі паглядзець наогул, як адносяцца комсамольцы да выпіскі газэт, дык можна сказаць, што яны цягнуцца ў хвасьце беспартыйных. **На студзень месяц комсамольцы выпісалі толькі 2 газэты, а беспартыйныя 33.**

М. Вясковы.

НАШ ВОПЫТ

Важнасьць распаўсюджваньня „Чырвонай Зьмены“ Астроўская ячэйка ЛКСМБ зразумела добра. Гэта пытаньне ячэйка паставіла на сходзе беспартыйнай моладзі дзе дастаткова растлумачана аб газэце. Зараз-жа, шляхам выкліку пачалася падпіска, у выніку чаго падпісалася 19 чалавек. Гэты вопыт ячэйка раіць усім вясковым організацыям.

Вясковец.

Копыльшчына.

На чорную дошку

* Красналольская комсамольская ячэйка, Расонскага раёну, Полацкай акругі, у якой налічваецца 14 чалавек, ня выпісвае ніводнага нумару „Чырвой Зьмены“.

А. Чарневіч.

* У Сакольшчынскай комсамольскай ячэйцы (Полаччына) Расонскага раёну па распаўсюджваньні газэты „Чырвоная Зьмена“ не праводзіцца ніякай працы. Выпісвае газэту толькі адзін комсамолец.

Зусім не праводзіцца праца сярод беспартыйнай моладзі, якая таксама вельмі мала выпісвае газэту „Чырвоная Зьмена“.

М. Звон.

* Анусінская ячэйка (Заслаўскі раён. Меншчына) не разгарнула працы па падпісцы на газэту „Чырвоная Зьмена“. У ячэйцы налічваецца каля 30 чалавек, а газэт выпісваюць 6 экзэмпляраў. Пры ячэйцы існуе піонэр-атрад, які таксама ня выпісвае газэт.

Трэба ячэйцы зараз-жа пачаць працу па распаўсюджваньні „Чырвонай Зьмены“.

Комсамолец.

* Падпіска на газэту „Чырвоная Зьмена“, сярод курсантаў Васілевіцкай трактарнай школы (Гомельшчына) пашырылася з 5 да 21.

Але трэба адзначыць, што комсамольская ячэйка мала зьвяртае ўвагі на распаўсюджваньне яе як сярод комсамольцаў, так і сярод беспартыйнай моладзі.

Трактарыст.

* „Чырвоная Зьмена“ зьяўляецца люстрам жыцьця ўсяе моладзі, але ня гледзячы на каштоўнасьць, якую яна прыносіць у сучасны момант, моладзь в. БОР (Рудзінскага с-с Меншчына) яшчэ і дагэтуль ня выпісвае і ня чытае „Чырвонай Зьмены“.

Упаўнаважаным і лістаносцам трэба зьвярнуць увагу на прасоўваньне газэты у вёску.

Ветка.

* У в. Клінок (Чэрвенскі раён, Меншчына) ёсьць комсамольская ячэйка, але комсамольцы гэтай ячэйкі ня выпісваюць і ня чытаюць „Чырвонай Зьмены“.

Драздоўскі С.Е

З фото-апаратам па Менску



Пазаўчора да будынку акгругкому КП(б)Б, дзе адбываўся пленум Менакругкому пад'ехаў своеасаблівы чырвоны абоз з каштоўнымі рэчамі: ліхтары, самавары, медныя каструлі і інш., якія былі сабраны саматужніцамі г. Менску на сваёй конфэрэнцыі. Акрамя гэтага былі перададзены акругкому шмат залатых рэчаў таксама сабраныя тут-жа на конфэрэнцыі.

Пасьля невялікага мітынгу, на якім выступілі т. т. Аксючыц, Крохмаль і інш., чырвоны абоз накіраваўся да заводу „Комунар“, дзе былі здадзены сабраныя мэталёвыя рэчы.

На здымку: абоз каля будынку акгугкому.

ПРОЛЕТСТУД АДСТАЕ АД ТЭМПАЎ

На паседжаньні кіруючай сямёркі штабу 3-хмесячніку, які адбыўся пры ЦК ЛКСМБ 24-га студзеня 30 году, былі заслуханы інформацыйныя паведамленьні ЦБ Пролетстуду і Белдзяржкіно аб мерапрыемствах у правядзеньні трохмесячніку. Высьвятлілася, што Пролетстуд не мобілізаваў дастаткова ўвагі студэнцтва на правядзеньне трохмесячніку, абмежаваўшыся толькі лістом-адозваю перад раз'ездам на вакацыі. Конкрэтных мерапрыемстваў не намечана, а лічаць, што мясцовыя організацыі самі правядуць работу, і потым дашлюць у ЦБ Пролетстуду зьвесткі. БДУ абмежавалася толькі некаторымі мерапрыемствамі, як чашкай чаю і інш.

Белдзяржкіно рыхтуецца значна лепей асабліва таму, што супадае пяцігадовы юбілей.

Па Менску, на працягу двух т[ыдняў], будзе прапушчана ў Доме Ку[льтуры] ўся вытворчасьць Белдзяржк[іно] з дыспутам, абгаварэньнем карці[н] іншым.

Такі ўдзел Пролетстуду сыгналі[зуе] аб небясьпецы ў правале важнага [па]літычнага мерапрыемства.

Культаддзел ЦСПСБ таксама н[і]што робіць, бо, калі тав. Клімк[оў] паехаў з Менску, дык ніхто з ку[льт]аддзелу ня змог прыйсьці, каб пр[ін]фармаваць аб удзеле профсаюз[аў у] трохмесячніку. Пара ўжо ўсім орг[ані]зацыям перайсьці ад складаньня [пла]наў да правядзеньня іх у жыцьцё.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Васілю—„Больш прыцягнуць жанчын для стварэньня колгасу“, **Мазылю**—„Вучком, табе патрэбна зьвярнуць увагу“, **Лепешко** — „Больш увагі“. Жыг-кі-т „Да ўсебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і вытворчасьці ня рыхтуемся“, **М.Звану**—„Хто возьмецца за працу“, **Якубу Постану**—„Кулацкія вылазкі супроць піонэраў“, **Вяскоўцу**—„Ад лесараспрацовак у баку“, **Кавалерыстаму Н. В.**—„Райком, зьвярні увагу“, **Комсамольцу** — „Антырэлігійная праца ў школе“, **Забабуву Янку Міколаву**—„Ударная брыгада“, **Колектывістаму**—„Паказвае прыклад рабочым“, **Агафіі Сыравінавай** —„Любімчыкі“. **Лохтманеру**—„Праца аслабла“, Я.—„Аб выстаўцы ніхто ня ведае“, **Вольнаму А**—„Выказваем недахопы“, **Аіру**—„Такіх настаўнікаў выгнаць са школы“, **Кавалерыстаму** — «Пастанова ня выконваецца“, **Пількевічу** — „Вясёлы кут карцёжнікаў“, **Вучню**—„Не падрыхтавалася“, **Бягуну**—„Зламаць інэртнасьць“, **Арончуку**--„Некалькі прапаноў у галіне падрыхтоўкі кадраў“, **Антончыку**,--„Вынікі барацьбы за портфэль“, **Ільянёву**--„Замазчык“, П.,--А.Х.--„Соц. спаборніцтва ўнутры“, Л. К.----„Пачынаецца праца“, „Даволі абманываць“. **Актывістаму школы**--„Якую політыку праводзіць старастат“, **Юнкору**--„Ганеньне на рабкора“, **Фрыду**--„Шорная фабрыка расьце“, **Д. П. Плышэвічу**--„Дарэмна ўбівалі час і энэргію“. **Т. М.**--„Пара ўжо“, **Знаючаму**--„Лешчынскі раён, Гарняцкі сельсавет памыліўся“, **Бачыушаму**,-**Герасімовічу**--„Прахлопалі“, **Горнаму**--„Як гуляюць каляды“. **Чэрамушняму**--„Яч. Бязбожнікаў сьпіць“, **Барысэвічу Янку**--„Ячэйка зрабіла правільна“, **Бураку**--„Аб недахопах ў Стара-Барысаўскім тэхнікуме“. **Янку Каліну**--„Аб падрыхтоўцы чырвоных кадраў“, **Акунёву**--„Дадзім тэхнічныя сілы ў тры гады“, **Дарожкіну**--„Даёш кузьню кадраў“. **Мятле**--„Замест культурнага мейсца--танцулькі“, **Комсамольцу**--„Далоў рэлігі[йны] дурман“, **Лявіцкаму**--„Камітэт узз[аемнай] дапамогі не працуе“, **Куніцкаму А[ляк]сю**--„У сувязі з колектывізацыяй у згуртаваньні моц“, **Баршаю і Па[л]ку**--„Анты-рэлігійны вечар на бухг[але]тэрскіх курсах пры **АКРАНА**. **Сель[]** **Чубару**--„Не марудзіць з падрыхто[ўкай] да вясеньняй сяўбы“, **Валку**--„Са[]рым пратры вочы“, **Сярдзюкову**--„В[]дак“--**Жыгальскаму**--„Перашлі на [] прарыўку“ **Піскуну Міхаою**--„Зьбі[]це попел“--Вашы матар'ялы непа[]ходзяць. Мала гаворыцца аб фа[] Аб гэтым можна пісаць ў насьцен[ную газ]эту.

ПАПРАЎКА

У № 20 „Чырвонай Зьмены“ ў п[ер]апошнім абзацы заметкі тав. А. К[]мана напісана: „З 105 чалавек у[дзель]нікаў комуністых усяго—45“, тр[эба] чытаць: „З 105 чалавек комуніс[тых] фабрыкі ва ўдарных брыгадах 45 [ча]лавек і г. д.“.

КомКамольск КАЛЕНДА[Р]

У сераду, 29-1—30 г. а [] гадзіне ўвечары адбудзецца п[асе]джаньне конфліктнай камісіі Ф[рун]зэўскага райкому ЛКСМБ.

У сераду, 29-1 роўна а 6-й га[дз.] ўвечары, у памяшканьні АК ЛКС[МБ] адбудзецца паседжаньне прыём[най] камісіі АК ЛКСМБ. Яўка сяброў АК ЛКСМБ абавязкова.

АК ЛКСМ[Б]

Адказны рэдактар
Рэдколегія

У парадку абгаварэньня

Нам патрэбна высока-мастацкая дзяржаўная капэла

У 1926 годзе організавана Беларуская Дзяржаўная Капэла. Яна налічвала каля 60 асоб. За час свайго існаваньня Беларуская Дзяржаўная Капэла абслужыла амаль усе рабочыя клюбы гораду Менску концэртамі, прымала ўдзел у мастацкіх перадачах Беларускага радыё-цэнтру. Сярэдняя колькасьць концэртаў у год даходзіла да 80. Але не заўсёды колькасьць пераходзіць у якасьць.

Хто ўважліва сочыць за разьвіцьцём Бел. Дзярж. Капэлы мог заўважыць, што за апошнія гады яна амаль уперад ні на крок ні пасунулася, як у сэнсе мастацкасьці выкананьня саміх музычных рэчаў, таксама і ў сэнсе музычнай культуры складу сьпевакоў.

Мастацкі твар сучаснай беларускай Дзяржаўнай Капэлы, безумоўна, ня можа задаволіць нават слухача з невялікі запатрабаваньнямі. Музычная культура працоўных Беларусі значна ўзрасла. Сама музыка пайшла далёка ўперад асабліва з яе тэхнічнага боку. А Бел. Дзярж. Капэла адстае ад гэтых тэмпаў у сваім разьвіцьці.

Якія-ж асноўныя прычыны таго, што капэла не прогрэсыруе?

Па-першае. Гэта ня зусім здаровы склад удзельнікаў капэлы, як з боку ўзросту таксама з боку галасавых дадзеных і соцыяльнага складу. Шмат сьпевакоў—старыкоў, якія бяруць свой пачатак ад царкоўных хораў. адсюль і цэлы шэраг вынікаў. У капэле існуе нездаровы ўхіл — рвацтва з боку асобных сьпевакоў. Няма партыйнага і комсамольскага актыву, няма жаданьня стварыць нешта каштоўнае—мастацкае, а ёсьць жаданьне пасьпяваць і нешта зарабіць. Сьпеўкі, рэпытыцыі наведваюцца не-акуратна, працоўная дысцыпліна недастатковая. Наркомасьветы на гэтую справу адпушчае вельмі мала грошай, каб можна было-б больш сур'ёзна заняцца акадэмічнай працай капэлы.

З усяго сказанага відаць, што мы маем толькі простае аматарства (часам з мэтай заробку) і ні ў якім разе мы ня можам дапусьціць каб сярэдняй вартасьці аматарскі хор зваўся ў далейшым Дзяржаўнай Капэлай.

Трохмесячнік беларускай культуры павінен прайсьці пад знакам палепшаньня працы ўсіх мастацкіх установ у тым ліку і Белдзярж. Капэлы. Трэба аздаравіць склад Капэлы за кошт рабочых з розных прадпрыемстваў гораду Менску. Трэба паставіць перад капэлай больш акадэмічныя задачы, і толькі пасьля таго, калі яна будзе сапраўдным мастацкім тварам Беларусі, тады можна выступаць перад працоўнымі гор. Менску, Беларусьсю, а таксама і ў другіх рэспубліках. Трэба сказаць, што Украіна, РСФСР, цікавяцца беларускай народнай песьняй і пасдаць туды добра-падрыхтаваную Капэлу было-б вельмі добрай і пажаданай справай.

Не закранаючы ў гэтым артыкуле пытаньня аб рэпэртуары Бел. Дзяр. капэлы, які таксама прымушае жадаць шмат новага і лепшага, мы толькі ўказалі на асноўныя недахопы. якія маюцца ў самой капэле.

Яўрэйская Дзяржаўная капэла ў гэтым сэнсе стаіць у значна лепшых умовах, бо на 90 проц. яна складаецца з рабочых менскіх фабрык і заводаў. Але трэба таксама сёньня ясна сабе ўявіць яе мэтавую установку АМАТАРСТВА АЛЬБО ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА. Конкрэтна аб ёй яшчэ цяжка гаварыць, бо невялікі тэрмін яе існаваньня не дае на гэта яшчэ права. Трэба таксама ўзьняць пытаньне аб організацыі польскага сталага хору, бо матар'ялу (галасавога) і запатрабаваньняў з боку насельніцтва больш чым дастаткова.

Трохмесячнік беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры павінен гэтую справу пасунуць уперад з кропкі замярзаньня.

Л.

У аўторак 28 І—30 г. у памяшканьні сталоўкі вагонных майстэрняў ст. Менск-таварная, а 6-ай гадз. увечары адбудзецца чыстка былога сэкратара Мен. АК ЛКСМБ тав. Папянкова П.

Праверком просіць усіх сяброў комсамолу і КП(б)Б г. Менску, якія ведаюць тав. Папянкова па рабоце, зьявіцца па чыстку.

Старшыня праверкому Мільгрэм.

Згублены

— Студэнцкае пасьведчаньне, на імя Шайкова Г. Т., выд. менскім політэхнікумам.

— Пасьведчаньне за № 13, на Кучмель Н. В., выд. менскім тэхнікумам.

— Заборная кніжка на хлеб, на Краскоўскага Ф. Ф., выд. МЦРК.

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599